**Ермалаеў, С.** Названы імёны лаўрэатаў / С. Ермалаеў // Герой працы (Шуміліна). – 2022. – 11 сак. – С. 1.

## НАЗВАНЫ ІМЁНЫ ЛАЎРЭАТАЎ

**Названы імёны лаўрэатаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны» па выніках 2021 года.**

Ганаровае званне штогод прыс войваецца 50 чалавекам па пяці намінацыях:

– прамысловасць, гандаль і паслугі, фінансавая дзейнасць, малы і сярэдні бізнес;

– аграпрамысловы комплекс, ахова навакольнага асяроддзя, лясная гаспадарка;

– жыллёва-камунальная гаспадарка, будаўніцтва і архітэктура, паліўна-энергетычны комплекс, сувязь, транспарт і камунікацыі;

– сацыяльная сфера (сацыяльная абарона насельніцтва, культура, адукацыя, навука, спорт, ахова здароўя, моладзь);

– забеспячэнне законнасці і правапарадку, папярэджанне і ліквідацыя надзвычайных сітуацый, дзейнасць органаў мясцовага кіравання і самакіравання, грамадскіх арганізацый.

Сёлета тры прадстаўнікі Шумілінскага раёна сталі ўладальнікамі ганаровага звання. Рашэннем Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта № 37 ад 24 студзеня 2022 года ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны» прысвоена:

у намінацыі «жыллёва-камунальная гаспадарка, будаўніцтва і архітэктура, паліўна-энергетычны комплекс, сувязь, транспарт і камунікацыі» **ФЕДЗЮКУ Вячаславу Аляксандравічу – абліцоўшчыку-плітачніку камунальнага ўнітарнага будаўнічага прадпрыемства «Шумілінская ПМК-70» і ШПАКАВУ Аляксею Арцёмавічу – дырэктару ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунапьнай гаспадаркі Шумілінскага раёна**;

у намінацыі «забеспячэнне законнасці і правапарадку, папярэджанне і ліквідацыя надзвычайных сітуацый, дзейнасць органаў мясцовага кіравання і самакіравання, грамадскіх арганізацый» **ТРАФІМАВУ Паўлу Альбертавічу – участковаму інспектару міліцыі аддзяпення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі аддзела ўнутраных спраў Шумілінскага раённага выканаўчага камітэта**.

**Сяргей ЕРМАЛАЕЎ.**